# КАНТРОЛЬНАЯ РАБОТА № 2. МАРФАЛОГІЯ

**Заданне 1. Насупраць дзеясловаў, якія абазначаюць адпаведныя тыповыя гукі, запішыце назоўнікі — назвы тых, хто гэтыя гукі ўтварае.**

*Максімальны бал = 5 (1 назоўнік – 0,5 балаў).*

1) выць, 2) чырыкаць, 3) гаргатаць, 4) бляяць, 5) каркаць, 6) журчаць, 7) стракатаць, 8) квахтаць, 9) мяўкаць, 10) кукарэкаць.

**Заданне 2. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.**

*Максімальны бал = 5 (1 правільна перакладзенае словазлучэнне – 0,5 бала).*

Сварить ботву, накрашенная бровь, притяжательное местоимение, маленький перепеленок, проданная посуда, встретиться на рассвете, отключённое электричество, сломанная прялка, солёная селёдка, красная гвоздика.

**Заданне 3. Выпішыце з тэксту ўсе назоўнікі, якія маюць ці могуць мець нулявы канчатак.**

*Балы: 1 слова = 0,5 бала.*

Цецярук
Цецерука
Цешыць сябра-дзівака:
— Я цябе
З тваёй цяцерай
Запрашаю
На вячэру.

Вечар
Цёмны
Ноч прыводзіць,
Цецярук жа
Не прыходзіць,
Не заве
На вячэру
І ні сябра,
Ні цяцеру.

*А.Дзеружынскі*

**Заданне 4. Займенники *ніхто* і *ўсе* — антонімы. Уявіце сабе такую маўленчую сітуацыю, у якой яны аказаліся б сінанімічнымі. Запішыце такое выказванне.**

*Максімальны бал = 4.*

**Заданне 5. Колькі назоўнікаў тут запісана? Выпішыце іх і ўкажыце, якое лексічнае значэнне яны маюць або могуць мець.**

*Балы: 1 бал за кожны назоўнік.*

Прыпынілася гаворка:
Вылезла з дупла вавёрка,
Мыш залезла ў сваю норку.

**Заданне 6. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову, увб дзеяслоў не паўтараўся..**

*Макс. бал = 5 (адно правільна запісанае словазлучэнне – 1 бал).*

Открыть дверь, открыть книгу, открыть глаза, открыть бутылку, открыть собрание.

**Заданне 7. Укажыце граматычнае значэнне падкрэсленых слоў і спосаб яго выражэння.**

*Балы: 1 слова = 1 бал.*

Браць — узяць; маленькі поні; ногі — нагі; лета змяніла восень; насіць — буду насіць.

**Заданне 8. Запішыце дзве назвы раслін, якія складаюцца з дзеяслова ў форме загаднага ладу і назоўніка ў форме вінавальнага склону.**

*Максімальны бал = 2 балы (1 бал = 1 назва)*

**Заданне 9. Выпішыце словы з нулявым канчаткам і патлумачце, ці існуе розніца паміж сцвярджэннямі:1) у слове няма канчатка; 2) у слове нулявы канчатак.**

*Балы: 0,5 бала за правільна падкрэсленае слова + 1 бал за тлумачэнне.*

Дзесьці, дзеці, горача, зелень, імкнуўся, сцвярджае, з кім, пішуць, там, пароль, дыстрыбуцыя, верабей, скажаш, свякроў, бясспрэчна, дробны, падышоў, па-мойму, паліто.

**Заданне 10. Запішыце па два дзеясловы з прыстаўкай *па-*, якія маюць значэнне:**

*Максімальны бал: 2,5 бала*

1. Закончанасці дзеяння: ... . 2. Пачатку дзеяння: ... . 3. Нязначнай ці няпоўнай меры дзеяння, што адбываецца на працягу кароткага часу: ... . 4. Няпэўнай працягласці, паўторнасці дзеяння: ... . 5. Дзеянняў, якія адносяцца да многіх асоб, прадметаў: ... .

**Заданне 11. Утварыце і запішыце парадкавыя лічэбнікі.**

*Максімальны бал = 4 балы (0,5 бала за кожны правільна запісаны лічэбнік)*

| | | |
|---|---|---|
| 1. | пяць → | |
| 2. | шэсцьдзесят → | |
| 3. | тысяча → | |
| 4. | сто семдзесят дзевяць мільёнаў → | |
| 5. | адзін → | |
| 6. | дваццаць пяць тысяч → | |
| 7. | дзвесце → | |
| 8. | дзевяцьсот дваццаць два (гады) → | |

**Заданне 12. З твораў Якуба Коласа выпісаны сказы. Вызначце трыванне падкрэсленых дзеясловаў. Патлумачце, якія сродкі дапамаглі Вам правільна вызначыць трыванне ў кожным выпадку. Адказ афарміце ў выглядзе прапанаванай табліцы.**

*Максімальны бал: 5 балаў (1 бал за кожны дзеяслоў)*

| № | Слова | Трыванне | Сродкі вызначэння трывання |
|---|---|---|---|
| | | | |

1. Міхал ішоў, з ім ішлі і думкі, а з імі вобразы ўставалі і ў сэрцы водгук ***выклікалі***. 2. Сваё галоўнае прызначэнне як настаўніка Лабановіч вызначаў так: абудзіць у вучнях і ***выклікаць*** да дзеяння крытычны розум. 3. Яно ***выклікала*** непакой у дзедавым сэрцы і клалася цяжкім каменем на яго старыя плечы. 4. Толькі дзесь сава-начніца, бы якая чараўніца, ***выклікала*** людзям ліха. 5. Пачуццё жалю і крыўды за сялянства ***выклікала*** ў маладога настаўніка абурэнне.

**Заданне 13. Выпішыце: 1) словы, якія называюць эмоцыі; 2) словы, якія выражаюць эмоцыі. Укажыце, да якой часціны мовы яны належаць, 3) з падкрэсленымі словамі прыдумайце і запішыце сказы.**

*Максімальны бал: 5*

Брава, вау, каханне, кпіць, Міхасёк, ***патоля***, прыкрасць, ***ох***.

**Заданне 14. Разам з нумарам сказа выпішыце выдзеленае слова і напішыце, да якой часціны мовы яно адносіцца.**

*Максімальны бал: 3 балы (0,5 бал за 1 правільна вызнач.часціну мовы)*

1. **Вечарам** горад станові..ца блакітным і паволі запальвае агні. 2. Гучаць вясёлыя песні, ідуць шчаслівыя па́ры, смяюцца і шэпчуцца **закаханыя**. 3. Даша са здзіўленнем пазірала на **ваеннага**, быццам не верыла, што гэта той самы Геня-сусед. 4. **Санлівага** не дабудзішся, **лянівага** не дашлешся. 5. Канчалася лета, дагараў **адзін** з апошніх жніўеньскіх дзён. 6. Усё **лепшае** ў жыцці параўноўваецца з вясною. 7.**Вякамі** ёй ходу-жыцця не давалі, вякамі чынілі насмешкі ды кпіны, вякамі крыўлялі, глушылі, тапталі вялікую мову няшчаснай краіны.

**Заданне 15. Калі словы пішуцца разам, пастаўце лічбу 1, праз злучок – 2, асобна – 3.**

*Максімальны бал: 3 балы (за кожную памылку здымаецца 0,5 бала)*

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Арт...салон | | Дып...корпус | | Арт...падрыхтоўка | |
| Асобасна...значымы | | Жуль...вернаўскі | | Маўленча...арыентаваны | |
| Мала...пісьменны | | На...ўцёкі | | Прадметна...алфавітны | |